В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# МАЎЛЕННЕ

## Стылі беларускай літаратурнай мовы

| План характарыстыкі | Гутарковы | Навуковы |
|---|---|---|
| 1. Мэта выкарыстання | Абмен думкамі, уражаннямі, інфармацыяй, нязмушаныя зносіны паміж людзьмі ў розных сферах | Перадача навуковай інфармацыі, выклад і тлумачэнне дасягненняў у галіне навукі |
| 2. Сфера выкарыстання | Гутаркі з блізкімі людзьмі ў неафіцыйных абставінах<br><br>сяброўскія лісты, прыватныя запісы | Выступленні на канферэнцыях, семінарах з лекцыямі, дакладамі, на ўроках, у аўдыторыях<br><br>энцыклапедыі, падручнікі, навуковыя і навукова-папулярныя кнігі |
| 3. Асноўныя адзнакі стылю (стылявыя рысы) | Неафіцыйнасць, нязмушанасць, натуральнасць размовы; вобразнасць, эмацыянальнасць, ацэначнасць; суб'ектыўныя адносіны да з'яў і падзей; дыялагічная форма | аб'ектыўнасць, лагічнасць, доказнасць, акрэсленасць, лаканічнасць, інфармацыйная насычанасць, змястоўнасць, маналагічнасць |

© ТДА «Аверсэв»

| План характарыстыкі | Гутарковы | Навуковы |
|---|---|---|
| 4. Моўныя сродкі стыляў | Агульнаўжывальныя размоўныя словы, дыялектныя, жаргонныя, прастамоўныя словы, эмацыянальна і экспрэсіўна афарбаваныя ацэначныя словы і фразеалагізмы | навуковыя і тэхнічныя тэрміны, абстрактныя словы, агульнанавуковыя кніжныя словы, словы з непераносным значэннем, рэдкае ўжыванне эмацыянальных слоў |
| | словы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, назоўнікі агульнага роду, прыметнікі з суфіксам -аст(ы) тыпу *вушасты*, рэдка дзеепрыметнікі | перавага іменнай лексікі над дзеяслоўнай, мн. лік абстрактных і рэчыўных назоўнікаў, частыя формы роднага склону назоўнікаў, рэдка займеннікі 1-й ас. |
| | сказы з выклічнікамі, часціцамі, займеннікамі, прыслоўямі, пабочнымі словамі. Словы-сказы, няпоўныя сказы, інверсія | шырокае выкарыстанне словазлучэнняў, апавядальныя сказы з прамым парадкам, складаныя і ўскладненыя розных відаў |



© ТДА «Аверсэв»

| План характарыстыкі | Афіцыйна-дзелавы | Публіцыстычны | Мастацкі |
|---|---|---|---|
| 1. Мэта выкарыстання | Паведамленне, перадача афіцыйнай інфармацыі, афіцыйныя службовыя адносіны людзей і ўстаноў | Уздзейнічаць на чытача і слухача, уплываць на яго перакананні і паводзіны | Уздзейнічаць на слухачоў ці чытачоў, адлюстроўваць у вобразах і карцінах духоўную сферу жыцця людзей |
| 2. Сфера выкарыстання | Аб'явы (напрыклад, па радыё, тэлебачанні, на сходах)<br><br>законы, статуты, даведкі, распіскі, пратаколы, заявы, акты | Публічныя выступленні на сходах, мітынгах, з'ездах<br><br>артыкулы, нататкі, рэпартажы, нарысы, фельетоны, памфлеты і інш. | Творы вуснай народнай творчасці, пастаноўкі ў тэатрах, мастацкія фільмы, творы мастацкай літаратуры (раман, аповесць, паэма, верш, п'еса, байка і інш.) |
| 3. Асноўныя адзнакі стылю (стылявыя рысы) | Аб'ектыўнасць, трафарэтнасць, стандартнасць, яснасць, дакладнасць, канкрэтнасць, лагічнасць, лаканізм, прадпісальнасць | Інфармацыйная насычанасць, канкрэтнасць, фактаграфічнасць, экспрэсіўнасць, эмацыянальнасць, пабуджальнасць, вобразнасць | Адзінства камунікацыйнай і эстэтычнай функцый, вобразнасць, мастацка-вобразная канкрэтызацыя, эмацыянальнасць, маналагічнасць і дыялагічнасць |

© ТДА «Аверсэв»

| План характарыстыкі | Афіцыйна-дзелавы | Публіцыстычны | Мастацкі |
|---|---|---|---|
| 4. Моўныя сродкі стыляў | Юрыдычныя і канцылярска-адміністрацыйныя тэрміны, адсутнасць эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі, стандартныя выразы | Грамадска-палітычная і абстрактная лексіка, эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначныя словы, вобразныя і стандартныя выразы, вобразныя сродкі | Лексіка розных стыляў, экспрэсіўна афарбаваная, ацэначная лексіка, разнастайныя вобразныя сродкі, словы з пераносным значэннем, аўтарскія неалагізмы, прыказкі, прымаўкі |
| | аддзеяслоўныя назоўнікі, частотнасць інфінітываў і пры іх слоў трэба і пад. | зборныя назоўнікі, складанаскарочаныя словы, абстрактныя назоўнікі, формы загаднага ладу, часціцы, выклічнікі | розныя граматычныя разрады слоў і розныя іх формы, уласцівыя для розных стыляў |
| | складаныя сказы, дзеепрыметнікавыя і дзеепрыслоўныя звароты. Не выкарыстоўваюцца сказы з выклічнікамі, часціцамі | прастата сінтаксічных канструкцый, частая інверсія, рытарычныя фігуры, далучальныя канструкцыі, пытальна-адказная форма | складаныя і ўскладненыя сказы, спалучэнне сінтаксічных канструкцый розных стыляў |



© ТДА «Аверсэў»

# Тыпы маўлення

Уся разнастайнасць зместу тэкстаў можа быць зведзена да трох тыпаў:

1) свет у статыцы, які ўспрымаецца прадметна, адначасова паводле ўсіх прымет і адлюстроўваецца ў тэксце тыпу апісання;

2) свет у дынаміцы, які ўспрымаецца ў развіцці, у паслядоўных падзеях у часе і адлюстроўваецца ў тэксце тыпу апавядання;

3) свет у прычынна-выніковых сувязях, што адлюстроўваецца ў тэксце тыпу разважання.

Схематычна будова тэкстаў можа быць прадстаўлена наступным чынам.

## Апісанне




## Апавяданне




## Разважанне






© ТДА «Аверсэв»

# Нормы беларускай літаратурнай мовы

| Нормы | Сутнасць нормы |
|---|---|
| Арфаэпічныя | правільнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў |
| Акцэнталагічныя | правільная пастаноўка націску ў словах |
| Арфаграфічныя | правільная перадача вуснай мовы на пісьме сродкамі беларускай графікі |
| Лексічныя | правільнае ўжыванне слоў у адпаведнасці з іх значэннем і правільнае спалучэнне слоў па сэнсе |
| Словаўтваральныя | правільнае ўтварэнне слоў паводле ўласцівых мове спосабаў і словаўтваральных мадэляў |
| Марфалагічныя | правільнае ўтварэнне і ўжыванне граматычных формаў слоў |
| Сінтаксічныя | правільнае ўтварэнне і ўжыванне словазлучэнняў і сказаў |
| Пунктуацыйныя | правільная пастаноўка знакаў прыпынку |
| Стылістычныя | правільнае ўжыванне моўных сродкаў у адпаведнасці з абраным тыпам і стылем, а таксама моўнай сітуацыяй |



© ТДА «Аверсэв»